Галоўнае ўпраўленне адукацыі Гродненскага аблвыканкама
Адзел адукацыі, спорту і турызму
адміністрацыі Кастрычніцкага раёна г. Гродна
Дзяржаўная ўстанова адукацыі
«Сярэдняя школа № 38 г. Гродна»

**Экскурсійнае прадстаўленне**

# “Ручнікі ў сямейнай традыцыйнай абраднасці беларусаў”

**(для ўдзелу ў абласным этапе рэспубліканскага конкурсу юных экскурсаводаў музеяў устаноў адукацыі)**

**Намінацыя “Музейная мазаіка”**


**Аўтар работы:**
**Цвік Валерыя Вітальеўна,**
**16 гадоў.**
**Кіраўнік:**
**Ходар Святлана Юльеўна,**
**кіраўнік музея,**
**8-029-582-40-56**


Гродно, 2021

**Ручнікі ў сямейнай традыцыйнай абраднасці беларусаў**

***Уводзіны. (слайд 1)***

Захаванне, вывучэнне і адраджэнне этнакультурнай спадчыны беларусаў з'яўляецца не проста данінай павагі да гістарычнага мінулага, але і неабходнай перадумовай гарманічнага існавання нацыі на сучасным этапе развіцця грамадства ва ўмовах інтэнсіўнага працэсу глабалізацыі.

Асаблівую ролю ў сямейных абрадах беларусаў: на вяселлі, уваходзінах, хрэсьбінах, пахаванні - выконваў і выконвае ручнік.

У сярэдняй школе № 38 г. Гродна існуе школьны музей «Хрысціянскія каштоўнасці і народныя традыцыі ў сям'і», у якім вялікая ўвага надаецца гісторыі беларускага народа, яго традыцыям і абрадам **(слайд 2).** І, канешне ж, экспазіцыя музея не магла абысціся без самых разнастайных ручнікоў, таму што традыцыйны побыт беларуса нельга ўявіць без ручніка – белага падоўжанага кавалка палатна з узорыстымі краямі.

У кожнай сялянскай хаце спрадвеку захоўвалася вялікая колькасць ручнікоў. Зразумела, ручнік – не толькі паласа тканіны для бытавых і гаспадарчых патрэб. А значна больш… Што мы сёння ведаем пра беларускі ручнік? Для большасці сучасных беларусаў гэта проста элемент аздобы. Мала хто памятае, што за кожным узорам на ручніку тоіцца глыбокі сэнс.

***Асноўная частка.***

Для беларусаў заўсёды была характэрна асаблівая роля ручніка ў сямейных абрадах: на вяселлі, уваходзінах, хрэсьбінах, у пахавальна-памінальнай абраднасці (**слайд 3**). Усе гэтыя ручнікі неслі адну і тую ж глыбінную сімволіку аховы, добразычлівага ўплыву найвышэйшых сіл. Арнамент служыў нашым продкам своеасаблівай мовай **(слайд 4)**. Варта адзначыць, што ў нашай краіне існуе такая багатая традыцыя выкарыстання ручнікоў – ад простых уціральнікаў да вясельных, пахавальных і ручнікоў на абразах.

У кожнай беларускай хаце, багатай ці беднай, ручнікі з'яўляліся абавязковым атрыбутам, і налічвалася іх больш трох дзясяткаў. На экране вы можаце пабачыць простыя, на першы погляд, ручнік-«уціральнік» **(слайд 5)**, са школьнага музея. Гэтым ручніком у паўсядзённым жыцці выціралі твар і рукі. Ён надзяляўся вялікай сілай ачышчэння. Сяляне ведалі, што за любую справу трэба брацца з чыстымі рукамі і чыстай душой. Таму і запрашалі дарагіх гасцей спачатку ў баню, каб змыць усе грахі.

Самы высокі статус меў ручнік-«набожнік» **(слайд 6)**. Паглядзіце на фотаздымак, калі ласка. На ім ручнік з калекцыі нашага музея. Гэтым ручніком упрыгожвалі чырвоны кут хаты, накрываючы абразы з выявай Ісуса Хрыста, Багародзіцы. Абавязковымі на ім былі крыжы і кветкі не толькі з двух бакоў, але і ўздоўж.

У ***радзінна-хрэсьбіннай абраднасці*** часцей за ўсё выкарыстоўваўся ручнік, на якім прымалі дзіця пры народзінах. Нараджэнню дзіцяці спакон вякоў нашыя продкі надавалі асаблівую ўвагу. Усе было скіравана на тое, каб жанчына лёгка нарадзіла, а дзіця з'явілася на свет здаровым і на радасць бацькам і ўсім людзям. Таму радзінны ручнік засцілаўся ў калыску дзіцяці, зберагаючы малое ад ўсялякіх злых духаў і хвароб. Выяву такіх радзінных ручнікоў вы можаце ўбачыць на экране **(слайд 7).**

Важную ролю выконваў спецыяльны ручнічок, якім прыкрывалі дзіця на хрэсьбінах. Ён з'яўляўся чароўным ланцужком паміж парадзіхай і кумамі, паміж кумам і кумой і нібы адорваў дзіця здароўем і моцай. За паслугі пры родах бабу-павітуху дзякавалі. Традыцыйны падарунак на радзінах - хлеб, абгорнуты ручніком.

Адным з асноўных атрыбутаў з'яўляўся ручнік у абрадах ачышчэння нованароджанага, а дзе-нідзе - усіх прысутных. Павітуха налівала ў міску вады, насыпала аўса і гэтай сумессю працірала ўсім твары, а кожнаму яна выказвала наступныя пажаданні: «Дай жа Божа, каб ты быў крэпак, як вада, багат, як зямля, вясёл, як пчала, а красен, як вясна».У дзень хрэсьбін кума прыходзіла ў дом да дзіцяці з хлебам-соллю, ручніком і грашамі.

***Вясельная абраднасць.***

Яшчэ да вяселля закаханыя дарылі адзін аднаму ручнікі з рознымі выявамі, што сімвалізавалі каханне і пяшчоту адзін да аднаго. Прыклады такіх ручнікоў вы можаце пабачыць на экране **(слайд 8).**

Вясельныя ручнікі ўваходзілі ў пасаг маладой, сведчылі пра яе працавітасць, умельства, густ. Адзін з іх можаце пабачыць на экране **(слайд 9).** Рыхтавала яна іх сама, часам з дапамогай бабулі і маці. З ручніком ішлі ў сваты, у знак згоды на шлюб пры заручынах ручнікамі нявеста перавязвала маладога.

Ручнік быў адным з асноўных спосабаў маркіроўкі галоўных дзейных асоб вяселля – маладой, маладога, свата і ўдзельнікаў дружыны маладога. У сваты хадзілі звычайна утрох: хросны бацька, бацька жаніха, старэйшы брат. Нават знакам згоды на шлюб была бутэлька з жытам, перавязаная поясам ці ручніком. Гэтая рэч была сімвалам поўнай згоды на шлюб. Цікава, што сваты падчас заручын сядзелі на лаве, якая была засцелена ручніком,

Таксама перад шлюбам бацькі бласлаўлялі маладых абразамі, упрыгожанымі ручнікамі, што звычайна вышываліся чырвонымі ніткамі, багата аздабляліся.

Сімвал яднання, духоўнай сувязі, кахання з'яўляўся ручнік-падножнік, на які станавіліся маладыя ў храме падчас вянчання і які надзяляўся самым высокім статусам. На ім вышываўся раслінны арнамент, імёны маладога і маладой, парады да сямейнага жыцця. Маладая імкнулася пацягнуць за сабой ручнік-падножнік у храме, каб сяброўкі хутка выходзілі замуж.

З ручнікоў рабілі вароты шчасця, пад якімі праходзіла маладая пара, вяртаючыся з царквы. Па старажытнай традыцыі пасля шлюбу бацькі сустракалі маладых караваем на вясельным ручніку. Каб выказаць гасціннасць і павагу, на маляўнічым ручніку і сёння ў нашай краіне падносяць хлеб-соль шаноўным гасцям.

Пасля вяселля адбываліся пеpазовы, калі родзічы маладых на працягу тыдня ходзяць адзін да аднаго ў госці. І тут таксама вялікая роля надавалася ручнікам. Госці з сабой бралі ў падарунак кавалак каравая, настольнікі (абрусы) і ручнікі. Ручнікамі гаспадары ўпрыгожвалі святочны стол, на які засцілалі два настольнікі і ўпоперак адзін ручнік, а шэсць ручнікоў вывешвалі на сцяне на абразы (фото ручнік-набожнік) і крукі.

Ручнік пасля шлюбу выконваў таксама ролю сімвалічнага пераходу да новага сацыяльнага і сямейнага статусу (маладая ўваходзіла ў хату маладога па палатне ці ручніку), а таксама знакам прысутнасці маладой у доме маладога і асваення ёй новай жыццёвай прасторы (вешае ручнік-«набожнік» на абразы ў доме маладога, развешвае ручнікі на вокны, па сценах і т. п.).

***У пахавальна-памінальнай абраднасці таксама шырока выкарыстоўваліся розныя віды ручнікоў.*** Ручнік падчас пахавання выкарыстоўваўся як знак жалобы па нябожчыку, калі яго вывешвалі праз вакно.

Пахавальны ручнік сімвалізаваў месца часовага прытулку душы памерлага (ручнік вісеў у доме на працягу 40 дзён). Ён спрыяў яе пераходу на той свет, будучы вывешаным праз вакно, паказваў ёй дарогу. Ягоную выяву можаце пабачыць на экране **(слайд 10).**

Ручнік перакідвалі праз вакно, сцялілі ад акна да стала, што сімвалізавала шлях вяртання дамоў продкаў – «дзядоў» у памінальныя дні. Гэта рабілася дзеля таго, каб душа памерлага не заблукала.

Таксама пры пахаванні ў дамавіну клалі ручнік (канцы нярэдка заставаліся звонку): ручнік як шлях, які злучае гэты і той свет, дарога на той свет, прадмет, які спатрэбіцца нябожчыку на тым свеце, каб уціраццa.

На ручніках або палатне звычайна апускалі труну ў магілу. На крыж, які ставілі над магілай, мужчынам вешалі ручнік (фота), жанчынам – фартух (фота), вянок – дзяўчынам. На Радаўніцу завязвалі ручнікі на надмагільныя крыжы і помніку — род ахвяры памерлым продкам, знак памяці аб іх і ўшанавання.

**Вывады.** Такім чынам, сёння тканыя, вышываныя ручнікі, якія можна назваць летапісамі душ, сталі сімваламі беларускай нацыі. Рукатворныя вырабы беларусаў, адзначаныя чароўнай непасрэднасцю, самабытным хараством і эстэтычным густам, зяўляюцца сапраўднымі першакрыніцамі духоўнасці беларусаў. У ручніку адчуваецца подых аддаленых эпох, сведомасць і звычаі колішніх пакаленняў. З даўніх часоў бяруць пачатак паважлівыя адносіны да тканіны, арнаменту гэтага незвычайнага прадмета, які нібы ланцугом звязваў розныя часткі абраду і сваёй прысутнасцю

аб’ядноўваў сямейную, каляндарную звычаёвасць. У ім адлюстроўваюцца пэўнае асэнсаванне рэчаіснасці, мадэль свету, якой доўгі час карысталіся нашы продкі.

Дзякуй за ўвагу **(слайд 11)**!

**Літаратура:**


1. Беларусы: у 8 т. – Т.5: Сям’я / В.К.Бандарчык [і інш.]; рэдкал.: В.К.Бандарчык [і інш.]; Ін-т мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору Нац. акад. Беларусі.– Мінск: Бел. навука, 2001. – 375 с.
2. Вяселле: Абрад / уклад., уступны арт. і камент. К. Цвіркі; муз. дадатак З.Я. Мажэйка; рэд. тома В.К. Бандарчык, А.С. Фядосік. – Мн.: Беларуская навука, 2004.–683 с.
3. Пахаванні. Памінкі. Галашэнні. – Мінск: Навука і тэхніка, 1986. – 615 с.
4. Радзіны: Абрад. Песні. – Мінск: Беларуская навука, 1998. – 637 с.
5. Сям’я і сямейны быт беларусаў / В.К.Бандарчык, Г.М.Курыловіч, Л.В.Ракава і інш. – Мінск: Навука і тэхніка, 1990. – 256 с.